УДК 370.153

*М. Ф. Бакуновіч*

# ДА ПЫТАННЯ ДАСЛЕДАВАННЯ МЭТ

Выбар жыццёвага шляху, самарэалізацыя асобы залежаць ад таго, наколькі яна здольна вызначаць мэты і падпарадкоўваць ім сваю дзейнасць. Мэта, з'яўляючыся вобразам прадбачанага выніку дзейнасці, абумоўлівае спосабы і характар дзеянняў і рэгулюе дзейнасць.

Тэарэтычныя даследаванні мэт жыццядзейнасці праводзяцца пераважна ў рамках вывучэння працэсаў волі (Л. С. Выгоцкі, У. І. Іваннікаў, В. П. Селіванаў і іншыя), самаарганізацыі і самарэгуляцыі (Дж. Мілер, Ю. Галантэр, К. Прыбрам, О. А. Канопкін, Г. С. Нікіфараў, В. І. Марасанава і іншыя). Да ліку спецыяльных прац у першую чаргу неабходна аднесці «Психологические механизмы целеобразования» [1]. Яна аб'ядноўвае шэраг асобных даследаванняў, у якіх працэс мэтаўтварэння разглядаецца ўсебакова: О. К. Ціхаміраў вывучае агульныя пытанні мэтаўтварэння; Э. Д. Цялегіна і Т. Г. Волкава выяўляюць узаемасувязі мэтаўтварэння і матывацыйна-эмацыянальнай рэгуляцыі дзейнасці; І. А. Васільеў вызначае суадносіны працэсаў мэтаўтварэння і інтэлектуальных эмоцый; Н. І. Ноткін паказвае мэтаўтварэнне ў кантэксце праблемы кіравання пазнавальнай дзейнасцю чалавека.

Псіхалагічны аналіз значэння мэт у жыцці чалавека разглядаецца ў працы І. А. Мартынюка [2]. Аўтар характарызуе розныя віды мэт, падставы іх фарміравання, узаемасувязі з іншымі псіхалагічнымі ўтварэннямі (патрэбнасцямі, матывамі, каштоўнаснымі арыентацыямі, планамі дзеяння), вызначае фактары, якія дэтэрмінуюць змест і накіраванасць матывацыйна-мэтавай сферы чалавека.

Эксперыментальнаму вывучэнню працэсаў матывацыі і мэтаўтварэння ў студэнтаў вышэйшай школы прысвечаны працы Р. Р. Бібрыха [3; 4]. Аўтарам вырашаліся наступныя задачы: выяўленне ўзаемаўплыву матываў вучэбнай дзейнасці на відавыя асаблівасці і механізмы мэтаўтварэння, выяўленне дынамікі мэтаўтварэння ва ўмовах рознай матывацыі.

Выкарыстанне ў эксперыменце праектыўнай методыкі дазволіла атрымаць вербальнае выражэнне разнастайных мэт; дадатковы дыягнастычны інструментарый дапамог вызначыць узаемасувязь мэт з матывамі, узроўнем дамаганняў, самаацэнкай студэнтаў. Агульным вынікам даследавання з'явілася раздзяленне ўдзельнікаў эксперыменту на 4 групы ў залежнасці ад дамінуючай матывацыі вучэбнай дзейнасці і асаблівасцяў мэтаўтварэння.

Пытанням мэтавызначэння ў дзейнасці выхавальніка прысвечана даследаванне Ф. І. Івашчанкі [5]. Аўтар выявіў асаблівасці выбару педагогам асноўных і ўскосных мэт пры вырашэнні выхаваўчых задач і спосабаў іх рэалізацыі. У эксперыменце ўдзельнічалі настаўнікі-прадметнікі і студэнты старэйшых курсаў педагагічнага універсітэта, што дазволіла вызначыць індывідуальныя адрозненні ў ступені разумення прамых і ўскосных мэт і ўключанасці апошніх у структуру дзейнасці.

Нягледзячы на тое, што тэарэтычнае і эксперыментальнае вывучэнне працэсу ўтварэння мэт пашыраецца і паглыбляецца, шэраг важных пытанняў застаецца ў ліку маладаследаваных. Да іх, у першую чаргу, можна аднесці праблемы фармулявання мэт, канкрэтызацыі агульных мэт, іерархізацыі мэт дзейнасці. Асаблівае значэнне надаецца вывучэнню працэсаў мэтаўтварэння ў вучэбнай дзейнасці студэнтаў педагагічных ВНУ. Існуе шмат прычын, якія абумоўліваюць актуальнасць даследаванняў у гэтай галіне дзейнасці.

Па-першае, у працэсе прафесійнага навучання ў вышэйшай школе фарміруецца будучы спецыяліст. Настаўнік, спалучаючы ў сваёй дзейнасці тэорыю і практыку, з'яўляецца асобай, якая разумее, «чаго яна дабіваецца», уяўляе, «як гэта ажыццявіць», кантралюе сябе «ў працэсе дасягнення сваіх намераў» і ўвесь час вырашае праблемы, «якія з фактараў могуць прывесці яе да жаданых вынікаў» [6]. Вось чаму ўменне прымаць і аналізаваць, фармуляваць і канкрэтызаваць мэты педагагічнай дзейнасці характарызуюць настаўніка як прафесіянала.

Па-другое, спецыфіка прафесійнай дзейнасці настаўніка прадугледжвае наяўнасць умення распрацоўваць мэты рознай ступені абагульненасці і рэалізоўваць іх у працэсе навучання і выхавання школьнікаў. Менавіта таму кожны ўрок варта пачынаць з фармулявання і тлумачэння мэты заняткаў у кантэксце агульных мэт і заканчваць абагульненнем рэальных вынікаў. Настаўнік тым самым спрыяе павышэнню эфектыўнасці вучэбнай дзейнасці і дасягненню сапраўдных поспехаў.

Па-трэцяе, уменне настаўніка фармуляваць дакладныя, канкрэтныя па зместу, іерархізаваныя мэты вучэбнай дзейнасці на аснове сваіх канкрэтных уяўленняў аб сістэме наяўных і магчымых ведаў і ўменняў вучняў дазваляе вызначаць перспектывы іх разумовага і асобаснага развіцця.

У кантэксце разумення прынцыпу дзейснага падыходу галоўнымі прадуктамі вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляюцца «разумовыя і практычныя аперацыі і дзеянні, свядомая і мэтанакіраваная рэгуляцыя ўласных паводзін і вучэбнай дзейнасці» [6]. Фарміраванне вучэбнага дзеяння як свядомага рэальнага акта заснавана на ўменні выкарыстоўваць наяўныя веды ў адпаведных сітуацыях рэчаіснасці. Таму пра-

цэс мэтаўтварэння, як самастойная пазнавальная дзейнасць і ўсвядомлены акт паводзін і зносін, з'яўляецца аб'ектыўным паказчыкам развіцця і фарміруецца ў працэсе вучэбнай дзейнасці.

Асаблівай увагі, на нашу думку, патрабуе даследаванн працэсаў мэтаўтварэння. У гэты перыяд яны адаптуюцца да навучання ў ВНУ. Адной з галоўных праблем з'яўляецца перабудова стылю вучэбнай дзейнасці ў школе. Навучанне ў вышэйшай школе характарызуецца павелічэннем аб'ёму тэарэтычнай інфармацыі, новымі спосабамі падачы матэрыялу, адсутнасцю пастаяннага кантролю звонку і інш. Для паспяховага асваення новых патрабаванняў вучэбнай дзейнасці студэнту неабходна:

1) усвядоміць значэнне новага матэрыялу ў кантэксце блізкіх і далейшых перспектыў дзейнасці;

2) авалодаць навыкамі самакантролю;

3) змяніць школьныя адносіны да вучэбнай інфармацыі (асэнсаваць яе адпосны, а не абсалютны характар);

4) пераадолець прывычку завучваць максімальную колькасць матэрыялу, схільнасць да суцэльнага канспектавання.

Каб рашуча перабудаваць школьны стыль вучэбнай дзейнасці, студэнтам I курса неабходна, перш за ўсё, навучыцца авалодаць працэсам успрымання мэт, якія ставяцца выкладчыкамі і сфармуляваны ў вучэбна-метадычнай літаратуры, аналізаваць іх неабходнасць, канкрэтызаваць агульныя мэты, іерархізаваць іх і распрацоўваць эўрыстычныя крокі здзяйснення, самастойна фармуляваць розныя віды мэт на падставе самааналізу ўласнага вучэбнага вопыту і сваіх магчымасцяў.

Такім чынам, даследаванне асаблівасцяў мэт вучэбнай дзейнасці дапаможа выявіць спецыфіку працэсаў мэтавызначэння і мэтаўтварэння, што, у сваю чаргу, дазволіць устанавіць аб'ектыўныя паказчыкі развіцця маладога чалавека і будучага спецыяліста.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. *Бибрих Р. Р.* Исследование видов целеобразования. Кишинев, 1987. С. 130.
2. *Бибрих Р. Р., Васильев И. А.* Особенности мотивации и целеобразования в учебной деятельности студентов младших курсов // Вестник Московского университета. 1987. № 2. С. 20—30.
3. *Иващенко Ф. И.* Особенности целеполагания в деятельности воспитателя // Психология. Мн., 1997. № 9. С. 3—10.
4. *Клевченя М. С.* Проблемы теории и практики дифференцированного обучения // Актуальные проблемы дифференцированного обучения. Мн., 1992. С. 6.
5. *Мартынюк И. О.* Жизненные цели личности: понятие,

структура, механизмы формирования. Киев, 1990. С. 124.
6. Психологические механизмы целеобразования / Отв. ред. О. К. Тихомиров. М., 1977. С. 251.
7. *Стоунс Э.* Психопедагогика: Психологическая теория и практика обучения. М., 1984. С. 162.

## SUMMARY

*Some aspects of investigation of purposes, their formation and determination are discussed in the article. Attention is paid to the insufficiently explored problems, such as wording, hierarchization, giving concrete expression to general purposes of activity. At the same time the necessity of studying of purposes formation processes in educational activity of pedagogical higher educational establishments' students is explained.*